Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| __________Д.В. Герасімёнак | __________Ю.М. Галкоўская |
| ___"__________2022 г. | ___"__________2022 г. |

ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# НУМІЗМАТЫКА

для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)

Складальнік:
І.Н. Колабава, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.06.2022
пратакол № 12

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:

Колабава І.Н., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і музеязнаўства УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Рэцэнзенты:

М.М. Елінская, кандыдат гістарычных навук, вядучы рэферэнт аддзела арганізацыйная работы, інфармацыі і выкарыстання дакументаў Дэпартамента па архівам і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Кафедра археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін УО “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт” (пратакол №10 ад 11.03.2022 г.)

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння:

кафедрой гісторыка-культурнай спадчыны
(пратакол № 10 ад 19.05.2022 г.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**


| | |
|---|---|
| 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА | 4 |
| 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 6 |
| 2.1 План-конспект лекцый | 6 |
| 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ | 35 |
| 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў | 35 |
| 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ | 41 |
| 4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў | 41 |
| 4.2 Пытанні для экзамена | 42 |
| 4.3 Тэст 1 (гісторыя грашовага абарачэння) | 44 |
| 4.4 Тэст 2(вызначэнне манет) | 50 |
| 4.5 Тэст 3(для канчатковага замацавання ведаў) | 58 |
| 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ | 67 |
| 5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны | 67 |
| 5.2 Асноўная літаратура | 69 |
| 5.3 Дадатковая літаратура | 69 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна–метадычны комплекс па курсу “Нумізматыка” для студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны” (па напрамках) распрацаваны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13.01.2011 г.; адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1–23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны 2013 г.; тыпавым вучэбным планам і графікам адукацыйнага працэсу. Праграма вучэбнай дысцыпліны узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства.

Праграма дысцыпліны “Нумізматыка” прызначана для студэнтаў II–IV курсаў спецыяльнасці “музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”.

**Мэтай** выкладання спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны – “Нумізматыка” з’яўляецца вывучэнне студэнтамі асноў агульнай нумізматыкі і этапаў гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.

Вывучэнне спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны “Нумізматыка” спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы.

**Актуальнасць** дадзенага курса вызначаецца яго роляй у працэсе падрыхтоўкі навуковых супрацоўнікаў турыстычных і музейных устаноў.

Мэтавая накіраванасць курса “Нумізматыка” акрэслівае шэраг задач, вырашэнне якіх забяспечвае засваенне неабходных ведаў, уменняў і навыкаў.

У выніку вывучэння курса “Нумізматыка” студэнты павінны **ведаць**:

– прадмет даследавання нумізматыкі;
– прыёмы і аб’екты даследавання нумізматыкі;
– інфармацыйныя крыніцы ў дадзеным кірунку;
– методыку самастойнай работы з крыніцай і апрацоўкі інфармацыі;
– гістарычныя ўмовы развіцця нумізматыкі;
– методыку выкарыстання набытых ведаў у музейнай працы;
– навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне;

**умець**:

– выкарыстоўваць прыёмы і метады нумізматычных даследаванняў;
– выкарыстоўваць дадзеныя нумізматыкі пры правядзенні практычнай і навуковай работы;
– праводзіць навуковую апрацоўку музейных нумізматычных калекцый;
– выкарыстоўваць інфармацыйныя крыніцы ў музейнай працы;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Нумізматыка” павінна забяспечыць фарміраванне наступных акадэмічных, сацыяльна-асабістых і прафесійных **кампетэнцый:**

УК – 1 Валодаць асновамі даследчай дзейнасці, здзейсняць пошук, аналіз і сінтэз інфармацыі

УК – 5 Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці

БПК – 8 Выкарыстоўваць тэарэтычныя і метадалагічныя асновы гісторыка-культурных і музеялагічных ведаў у дзейнасці сучаснага музея і даследаванняўаб’ектаў культурнай і прыроднай спадчыны.

СК – 4 Выкарыстоўваць метады і дасягненні спецыяльных гістарычных дысцыплін для выяўлення, крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыіі музейных крыніц.

Дысцыпліна “Нумізматыка” непасрэдна звязана з такімі дысцыплінамі, як “Археалогія”, “Этналогія і этнаграфія Беларусі”, “Гісторыя Беларусі”, “Палеаграфія”, “Генеалогія” і г.д.

Асноўнымі формамі навучання па дысцыпліне з’яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах якіх знаходзяцца нумізматычныя калекцыі.

Пры вывучэнні курса “Нумізматыка” выкарыстоўваюцца сучасныя метады навучання і камп’ютарныя тэхналогіі.

Форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

### Уводзіны

1. Прадмет, задачы і крыніцы нумізматычных даследаванняў.
2. Нумізматычнае калекцыяніраванне.
3. Станаўленне навуковай нумізматыкі. Гістарыяграфічны агляд

Нумізматыка – спецыяльная гістарычная дысцыпліна, вывучаючая гісторыю грашовых сістэм і грашовага абарачэння.

Асобныя яе раздзелы вывучаюць даманетныя сродкі пляцяжу і рыначнага абарачэння (таварагрошы) і папяровыя грошы (баністыка).

Numismatica – nomismaticos (новагрэч. прыметнік – манетны) – nomisma (стар.грэч. назоўнік – манета) – nomos (стар. грэч. назоўнік – звычай, права, закон, плацёжны сродак).

Прадмет вывучэння – манеты, скарбы, даманетныя сродкі плацяжу, папяровыя грошы.

Задачы нумізматыкі – вывучэнне гісторыі грашовых сістэм і грашовага абарачэння. Сучасная нумізматыка мае сваёй асноўнай задачай комплекснае даследаванне, накіраванае на выяўленне пэўных падзей гісторыі, якія знайшлі ў ёй свае адлюстраванне. Нумізматычнае даследаванне ўяўляе сабой не толькі элементарнае вывучэнне манет, але і вызначэнне пробы, аналіз штэмпеляў, статыстычныя падлікі і г.д.

Нумізматычныя крыніцы – 2 групы:

1.Асноўныя (адначасова гэта і нумізматычныя помнікі) – манеты і манетныя скарбы, матэрыялы і прылады манетнай чаканкі, разнавагі (для праверкі масы манет);

2.Дапаможныя нумізматычныя крыніцы – таварагрошы, узнагародныя знакі, пячаткі, папяровыя грошы, пісьмовыя крыніцы, звязаныя з манетным правам (дакументацыя манетных двароў, пастановы па рэформам манетнай справы і грашовага абарачэння, гандлёвыя дакументы, мытныя кнігі, тэстаменты, прыхода-выдатковыя кнігі, судовыя дакументацыя).

Метады нумізматычнага даследавання – тапаграфічны аналіз, статыстычны аналіз, кампаратыўны аналіз (параўнальны).

У нумізматыцы пры аналізе якасці манет выкарыстоўваюцца фізічныя метады даследавання, ізатопнае і гама-выпраменьванне.

Сувязь нумізматыкі з іншымі гістарычнымі дысцыплінамі – археалогіяй, музеязнаўствам, этнаграфіяй, сфрагістыкай, фалерыстыкай, метралогіяй, храналогіяй, палеаграфіяй, эпіграфікай і інш.

Станаўленню нумізматыкі як навукі папярэднічаў перыяд назапашвання фактычнага матэрыялу. Традыцыя калекцыяніравання манет

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складалася з антычных часоў, калі манеты разглядаліся з эстэтычнага пункту гледжання, а не як сродкі грашовага абарачэння.

Асновы навуковай нумізматыкі ў канцы XVIII ст. былі закладзены прафесарам Венскага універсітэта І. Эккелем.

У Расіі пытаннямі фіксацыі нумізматычных помнікаў займалася Маскоўскае таварыства гісторыі і старажытнасцяў (1804), Рускае археалагічнае таварыства (1846), Імператарская Археалагічная камісія (1859).

У СССР фіксацыяй і навуковай апрацоўкай помнікаў нумізматыкі займаліся музейныя і акадэмічныя ўстановы.

У Беларусі на працягу XVI – XX стст. былі вядомы нумізматычныя калекцыі прадстаўнікоў рода Радзівілаў, Сапег, М. Румянцава, Я. і К. Тышкевічаў, І. і Ф. Паскевічаў, Е. Раманава, В. Федаровіча, А. Брадоўскага і інш.

Заснавальнікі беларускай навуковай нумізматыкі – П. Харламповіч і М. Шчакаціхін. Навуковая дзейнайсць В.Н.Рабцэвіча.

У другой палове XIX – XX ст. на тэрыторыі Беларусі складаюцца нумізматычныя калекцыі Віленскага музея старажытнасцяў, музеяў пры губернскіх статыстыстычных камітэтах, царкоўна–археалагічных музеяў, Беларускага гісторыка-этнаграфічнага музей імя І. Луцкевіча, Беларускага Дзяржаўнага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, нумізматычнага кабінета Белдзяржуніверсітэта, музея Нацыянальнга Банка Рэспублікі Беларусь.

Музейныя нумізматычныя калекцыі ў Еўропе і ЗША – Брытанскі музей, Аддзел медалёў і старажытнасцеў Парыжскай Нацыянальнай бібліятэкі, Берлінскі мінцкабінет, Венскі мінцкабінет, Нацыянальны музей у Празе, Музей амерыканскага нумізматычнага таварыства (Нью-Іорк). Нацыянальны нумізматычны сход (Вашынгтон, музей гісторыі і тэхналогіі Смітсонаўскага інстытута), Нацыянальны музей (Варшава), Нацыянальны музей (Кракаў), Аддзел нумізматыкі Дзяржаўнага гістарычнага музея (Масква), Аддзел нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа (Санкт-Пецярбург).

## Раздзел І Асновы агульнай нумізматыкі

### Тэма 1 Уласцівасці тавару і функцыі грошай

1. Уласцівасці тавару
2. Функцыі грошай

Тавар – прадукт чалавечай працы, зроблены на продаж ці адмен на іншы тавар.

Тавар мае тры асноўныя ўласцівасці.

Спажывецкая вартасць (тавар здольны задаволіць канкрэтныя патрэбы чалавека). Спажывецкая вартасць падзяляе тавары па якасці, яна мае пэўную стабільнасць і какрэтнасць. Прыклады.

Менавая вартасць паказвае колькасныя адносіны, ў якіх адзін тавар можа быць абменены на другі. Менавая вартасць падзяляе тавары колькасна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менш стабільнае і больш абстрактнае паняцце ў параўнанні са спажывецкай вартасццю. Прыклады.

Вартасць – здольнасць тавара матэрыяльна ўвасобіць укладзеную ў яго працу. Прыклады.

З развіццём гандлёвых сувязяў вартасць шэрагу тавараў пачынае прыраўнівацца да вартасці якога-небудзь аднаго тавара, які меў вялікае значэнне і распаўсюджанасць у пэўным рэгіёне.

Такім чынам, з масы тавараў вылучаюцца таварагрошы (дастаткова распаўсюджаны, маюць высокую і стабільную вартасць).

У народаў, што займаліся скатаводствам, такім таварам – усеагульнай мерай вартасці – стаў скот. У далейшым у якасці таварагрошай выкарыстоўваюцца разнастайныя металічныя вырабы.

Грошы – спецыфічны від тавара і народжаны ім.

Матэрыял для грошай павінны быў мець:

1.Больш стабільную менавую, але абмежаваную спажывецкую вартасць.

2.Захоўваць якасці пры драбленні і зліцці.

3.Кампактнасць.

4.Фізічнае даўгалецце.

Гэтым патрабаванням адпавядалі металы і металічныя сплавы. Такім чынам, каштоўныя металы (золата, срэбра, плаціна) маюць абмежаваную спажывецкую вартасць (вельмі вузкая сфера выкарыстання) і высокую менавую вартасць.Функцыі грошаў:

1.Мера вартасці (здольнасць грошаў вымяраць менавыя вартасці любых тавараў). Прыклады.

2.Сродак абарачэння (грошы – пасрэднікі пры адмене аднаго тавара на другі). Прыклады.

3.Сродак плацяжу (здольнасць грошаў функцыянаваць ў адрыве ад тварнага абарачэння). Прыклады.

4.Стварэнне скарбаў (сродак назапашвання грашовых запасаў, якія часова не ўдзельнічаюць у абарачэнні). Прыклады.

5.Сусветныя грошы (вольнае абарачэнне грошай з высакародных металаў на межамі сваіх краін).

## Тэма 2 Манета. Матэрыяльныя і знешнія характарыстыкі. Манеты нерэгулярных эмісій. Манета ў нумізматычным зборы

1. Матэрыяльныя характарыстыкі манеты. Знешнія характарыстыкі манеты.
2. Манеты нерэгулярных эмісій.
4. Манета ў нумізматычным зборы

Аснова нумізматычнага даследавання – манета. Паданне аб аб пераносе манетнага двара ў храм Юноны-Манеты.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкарыстанне слова “манета” на старажытнарымскіх манетах (1 ст. да н.э.), заходнееўрапейскіх (XI ст.), у Польшчы (X1V ст.), у Вялікім Княстве Літоўскім (1492), у Расіі (1701).

Найстаражытныя манеты – Старажытна Кітай (XII ст. да н.э.). Ксенафан з Калафона, Герадот – меркаванне, што 1-я манеты чаканены ў Лідзіі (захад Малазійскай п-пы) у VП ст. да н.э., пазней іх вытворчасць засвоіла Эгіна.

Кожная дзяржава мае сваю грашовую сістэму, заснаваную на канкрэтнай манетнай адзінке (рубель, даляр, франк...) у выглядзе пэўнай колькасці грашовага металу. Манета ў адну грашовую адзінку – асноўная, у две ці некалькі – зборная, у частку грашовай адзінкі – дробная.

Манета характарызуецца двумя асноўнымі групамі прыкмет.

Матэрыяльныя (метал, маса, манетная стапа, проба).

Манетна стапа – дакладна вызначаная колькасць экзэмпляраў манет аднаго і таго ж намінала, якія павінны быць адчаканены з дакладнай вагавай адзінкі метала. Выкарыстанне правіла манетнай стапы дазваляла вытрымліваць сярэднюю масу манеты. Прыклады.

Проба – утрыманне чыстага высакароднага металу ў сплаве, з якога зроблена манета ці ювелірны выраб. Існуе чатыры сістэмы проб: метрычная, каратная, залатніковая, лотавая.

Знешнія (форма, поле манеты, выявы, ліцевы, адваротны бакі, гурт, апушка, легенда, тып манеты, намінал).

Аверс (Av), рэверс (Rv). На аверсах звычайны знаходзіцца выява ці надпіс, якія сведчаць пра дзяржаўную прыналежнасць ці партрэтная выява вядомай асобы.

Гурт – бакавы зрэз манетнага кружка. З 1570-х гг. на многіх еўрапейскіх манетах з’яўляецца спецыяльна апрацаваны гурт з насечкай, малюнкамі, надпісамі. Можа быць рубчаты, снуравідны, сетчаты, узорчаты, з надпісамі.

Легенда – гэта надпіс.

Чатыры разнастайнасці легенд – радковая, кругавая, камбінаваная, гуртавая.

Па зместу легенда можа складацца з наступных частак: імя эмітэнта, тытул эмітэнта, дэвізы і выказванні, дата, імя манетнага майстра, назва манетнага двара, эмісійны знак і інш.

Манеты ў асноўным выrabляюцца для масавага выкарыстання. Але есць манеты, якія адрозніваюцца ад стандартных.

Памятныя (мемарыяльныя) прысвечанныя памятным падзеям.

Пробныя – для ацэнкі манетным сеньёрам новага штэмпеля перад масавым выпускам.

Данатыўныя манеты выкарыстоўваліся для падарункаў.

Манеты надзвычайных абставін. Асаблівасці – у большасці з некаштоўных металаў, разнастайная форма, прызначаюцца часам для разлікаў з наёмнікамі, гандлярамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наваробная манета – выраблена захаваўшыміся сапраўднымі штэмпелямі ў больш познія часы з таго ж металу. Магло ставіцца спецыяльнае кляймо.

Антыкварныя падробкі з’явіліся ў X1V ст. Выраблялі такія падробкі прыватныя майстры для падману калекцыянераў тэхнікай адліўкі, шляхам выраблення новага штэмпелю ці стварэння гальванапластычнай копіі.

Прыватныя грошы з некаштоўных металаў выраблялі прыватныя прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемства, гарадскія муніцыпалітэты. У Расіі яны называліся боны ці маркі, у Англіі – токены.

Памятныя жэтоны адрозніваюцца ад медалёў меншымі памерамі, выкарыстоўваліся як падарункі да святаў. Каранацыйныя жэтоны звычайна чаканілі з высакародных маталаў.

Разнастайнасць жэтонаў – маркі тэатральныя (на права ўваходу ў тэатр), на права ўезда ў горад, цэхавыя (прыналежнасць да пэўнага цэху).

Фальшывыя манеты (не блытаць з антыкварнымі падробкамі) – незаконна вырабленныя манеты з метай пуска іх у абарачэнне. Знешне практычна не адрозніваюцца ад сапраўдных. У іх больш нізкая проба, таныя матэрыялы і выкарыстанне пазалоты ці срабрэння. Прымяняўся шлях адліўкі ці ствараўся новы штэмпель.

Манеты – перайманні адрозніваюцца ад фальшывых тым, што пераймаўся манетны тып, а не манетная стапа. Прычына – імкненне манетных сеньёраў да забеспячэння актыўнага і выгоднага выкарыстання сваёй манеты ў краіне і за мяжой. Узорамі становяцца папулярныя манеты.

Манеты, паступаючыя ў музейныя калекцыі праходзяць адпаведную дакументную фіксацыю.

Зачастую манеты пакрыты карозіяй (слаямі розных вокіслаў). Чыстка манеты праходзіць некалькі этапаў (вызначэнне метала, увільгатненне, хімічная, механічная чыстка, кансервацыя).

Для вызначэння калекцыйнай вартасці манеты істотнае значэнне мае вызначэнне яе захаваннасці і рэдкасці.

## Тэма 3 Тэхніка манетнай вытворчасці

1. Тэхніка ліцця
2. Тэхніка ручной чаканкі манет

Манета – прадмет масавай спачатку рамеснай, а потым – машынай вытворчасці – помнік гісторыі тэхнічнай думкі. Веданне працэсу вырабу манет аказвае дапамогу ў іх вызначэнні.

У антычнасці выкарыстоўвалася тэхніка ліцця (выраблення ліцейнай формы, ліцікі, спецыфіка літых манетных кружкоў, чаканка з дапамогай аднаго ніжняга штэмпеля).

Тэхніка еўрапейскай ручной чаканкі – 5 этапаў:

1. – падрыхтоўчыя работы,

2. – выраблення манетных пласцін,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. – вырабленне штэмпелей,

4 – чаканка манет,

5. – верыфікацыя манет.

1. Работы металургічнага характара (ачышчэнне і плаўленне , цаны).

2. Плюшчэнне цанаў малаткамі, плюшчыльны стан. Вырабленне ручным спосабам манетных пласцін, кліпы.

3-4. Штэмпелі (стальныя ці бронзавыя стрыжні). На тарцах штэмпеляў гравіраваліся ці выбіваліся пуансонамі негатыўныя выявы і надпісы. Штемпелі манет XI – XII стст. з нескладанай выявай вырабляліся за 15–30 хвілін, складаная выява з высокім рэльефам выраблялася за 2–3 дні.

5. Верыфікацыя (юсціроўка, паверка манет) – знешні агляд, праверка памераў, выбарачная праверка масы.

Спецыфіка тэхнікі рускай ручной чаканкі

Асаблівасці тэхнікі выраблення брактэятаў. Прызначаліся для абарачэння на невялікай тэрыторыі.

Спецыфіка захоўвання брактэятаў у нумізматычнай калекцыі.

Механізацыя працэсаў выраблення манеты.

Тэхніка вальцверка. У 1570-я гг. тэхніка вальцверка знайшла некаторае распаўсюджанне ў Еўропе, у Расіі ў XVII ст. зафіксаваны адзіны выпадак яе выкарыстання.

Тэхніка выраблення гурта.

Далейшы прагрэс тэхнікі манетнай вытворчасці звязаны з выкарыстаннем конскай цягі, магутнасці вады, з вынаходніцтвам паравога рухавіка, электрычнасці.

Скіфатныя манеты – асаблівая форма манет, абумоўленая тэхнічнымі прыёмамі пад час чаканкі.

Хібнасці пры вырабленні манет ручным спосабам.

Блізка да перачанкі стаіць надчаканка (контрамаркіраванне), пры якой на манеце ставіцца невялікій знак, літары, выявы. Яна санкцыяніруе выкарыстанне іншаземнай манеты ці змену вартасці. Прыклады.

## Тэма 4 Скарбы – помнікі гісторыі і культуры. Манета ў побыце, звычаях і вераваннях

1. Скарбы – помнікі гісторыі і культуры

2. Манета ў побыце, звычаях і вераваннях.

Скарб – комплекс манет, характэрны для пэўнай тэрыторыі і часу сваім складам, спосабам захоўвання і інш.

Грашовыя сховішча знаходзяць, як правіла, самым празаічным чынам – пры с/гаспадарчых, будаўнічых работах. Часам, гэта адбываецца і пры надзвычайных абставінах, калі старадаўнія скарбы адкрываюць прадстаўнікі фаўны ці прыродная стыхія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Скарбы – матэрыяльныя сведчанні шырока (літаральна да XIX ст.) распаўсюджанага звычая захоўвання каштоўнасцеў, звычайнасць якого дэманструецца складам і характарам манетных захаванняў.

Абсалютная большасць скарбаў – вельмі сціплыя для свайго часу зберажэнні, што сведчыць аб прыналежнасці іх шырокім незаможным слаям насельніцтва.

– Дэпазіты, як правіла, вельмі добра ўпакаваны.

– Звычайна скарб знаходзіцца на невялікай (0,2 – 0,5м) глыбіні, радзей – больш глыбока (1 – 1,5 м)..

– У XVI ст. сфарміравалася асобая отрасль ганчарнага рамёства па вырабу разнастайных па аб'ёму і форме начынняў для скарбаў.

Цяжкія абставіны вымушалі людзей частей, чым звычайна, перадаваць свае зберажэнні зямлі. Узмацненне тэзаўрыравання грашовых сродкаў, як следства бурлівых падзей, незаўсёды можа характарызаваць цэлы перыяд таварна-грашовага абарачэння, з'яўляясь толькі яго эпізодам.

Насуперак бытуючым уяўленням, скарбы зусім не адносяцца да рэдкіх помнікаў даўніны.

Агульная грашовая сума, якая патрабуецца для нармальнага функцыянавання рыначных механізмаў – велічыня непастаяная. У залежнасці ад ваганняў масштабаў таварнага абарачэння і інтэнсіўнасці працэсаў куплі-продажу, яна будучы дастатковай сёння, можа аказацца недастатковай ці, насупраць, занадта значнай заўтра.

Гэты дысбаланс знікае пры пападанні грошай у рэзервныя фонды, якія ў залежнасцці ад рыначнай кан'юктуры, застаюцца стабільнымі, павялічваюцца ці памяншаюцца. Так узнікаюць рэгулятары грашовага абарачэння – скарбы.

Працэс даследавання скарба складаецца з двух этапаў – атрыбуцыя кожнай манеты (дзяржаўная прыналежнасць, эмітэнт, манетны двор, намінал, дата чаканкі, метралагічныя і якасныя характарыстыкі) і ўстанаўленне часа захавання.

Апошняя задача часта становіцца найбольш складанай – відавочна, што скарб можа быць захаваны не раней года чаканкі малодшай з манет, але пры вырашэнні пытання – прыходзіцца ўлічваць шэраг дадатковых фактараў:

Часам састаў скарба і асаблівасці захавання дазваляюць меркаваць не толькі аб сацыяльным статусе гаспадара, але і аб характары яго штодзённай дзейнасці, а таксама аб канкрэтнай прычыне тэзаўрацыі.

Адзін ці некалькі скарбаў не ў стане выразіць усю складанасць і шматграннасць таварна-грашовых адносінаў рынка, помнікамі якога яны з'яўляюцца. Больш таго, асобныя манетныя скарбы складаюцца з выпадковых, нехарактэрных для дадзенага рэгіёна манет. Таму ў нумізматычных даследаваннях эфектывен толькі метад, заснаваны на аналізе многіх дзесяткаў і сотняў скарбаў, іх тапаграфаванне ў спалучэнні з дадзенымі пісьмовых крыніц і археалогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Манетныя скарбы – вельмі спецыфічныя і змястоўныя помнікі, якія непрадузята адлюстроўваюць склад і заканамернасці ўнутраных і міжнародных, палітычных і культурных сувязяў той ці іншай краіны ў пэўны перыяд.

Састаў манетных скарбаў дае ўяўленне аб грашовых сістэмах краін, якія вывозілі ці ўвозілі манеты. Кожны скарб дазваляе дастаткова дакладна датаваць начынне і рэчы, што знаходзіліся разам з манетамі.

У адрозненні ад археалагічных артэфактаў, якія адкрываюць шляхам планамерных раскопак, пераўтварэнне скарба ў знаходку – вынік супадзення шэрагу выпадковасцей.

Выпадкова тое, што ў свой час начынне з манетамі было захавана менавіта ў гэтым, а не ў іншым месцы; выпадкова тое, што яе ўладальнік не змог выкарыстаць назапашаныя грошы; выпадкова, нарэшце, тое, што лемех рала, коўш экскаватара ці рыдлёўка землякопа вывярнулі менавіта той пласт зямлі, які ужо раней быў патурбаваны пры захаванні скарба.

Менавіта таму неабходны асабліва беражлівыя адносіны да гэтых выбітных помнікаў, кожны з якіх па асобнаму ўнікален.

Класіфікацыя скарбаў. Грашовыя і грашова-рэчавыя скарбы прадстаўлены некалькімі катэгорыямі:

Страчаныя.

Зваротныя.

Незваротныя.

Кароткатэрміновага назапашвання.

Доўгатэрміновага назапашвання.

Надзвычайных абставінаў.

Скарбы фальшывых манет.

Знаходкі грашовых і грашова-рэчавых скарбаў на тэрыторыі Беларусі

На тэрыторыі Беларусі зафіксавана (з XIX ст.) па розным прыблізным падлікам ад 1000 да 2000 манетных і манетна-рэчавых скарбаў. Знаходчыкамі скарбаў маглі стаць прадстаўнікі фаўны ці прыродная стыхія.

Знакамітыя скарбы.

– в. Каз’янкі Полацкага р-на, правы бераг Заходняй Дзвіны. 1973. Скарб завёрнуты ў бяросту. Вядома 7711 дзірхамаў Арабскага Халіфата. Разбойніч’я казна на шляху “з вараг у грэкі”. Час захавання – 944-945.

– в. Вішчын Рагачоўскага р-на. 1979. Археалагічная экспедыцыя БДУ – грашова-рэчавы комплекс –грыўні трох тыпаў – літоўскі, кіеўскі, наўгародскі і жаночыя ўпрыгажэнні.

Скарб надзвычайных абставінаў. Час захавання – канец 1 трэці XIII ст.

– г. Полацк. 1997. Вядома 14 манет – медныя (некаторыя – з адбіткамі лужэння), білоныя, 1 бронзавая, 1 высокапробнага срэбра – паўфабрыкаты для будучых фальшывак. Час захавання – паміж 1540 и 1550.

– г. Рогачев. 1971. Больш за 1000 медных манет, часткова з адбіткамі лужэння, загорнутых у тканіну. Вядома 485 экз. прымітыўных фальсіфікатаў – 1/12 талера Прусіі 1766 г., 10-грашовікаў Каралеўства Польшчы ў складзе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Расійскай імперыі 1830 – 1831 гг. і 10-грашовікаў 1831 г., чаканеных у Варшаве ў часы Польскага паўстання 1830 – 1831 гг. Аналалаў у свеце няма. Час захавання 1831 – пач. 1832.

– г. Мінск. 1988. 547 срэбраных прадметаў (13 кг) – посуд, падсвечнікі – 25, Георгіеўскія крыжы (31) і медалі (30, манеты Расіі і Германіі – 461 (кан. XIX – пач. XX ст.).

Скарбы ў народным фальклоры падзяляюцца на злыя (замоўленыя) і добрыя.

Скарбавыя сюжэты фальклора – люстэркавае адлюстраванне рэальнай рэчаіснасці, расквечанай народнай фантазіяй.

У хаце грошы захоўваліся ў куфэрках і іншых спецыяльных патаемных месцах.

Манеты выкарыстоўваліся ў вясельных святах, клаліся пад рог падмурка ці ў куты вянца драўлянай пабудовы, упрыгожвалі абразы, служылі падарункам парадзіхе, клаліся нябожчыку пры пахаванні, ахвяраваліся вышэйшым сілам, манетамі рабіліся падарункі на святы.

## Раздзел 2 Гісторыя грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ў канцы II ст. – пачатку XXI ст.

## Тэма 5 Перыяд рымскага дэнарыя (2-я палова II – 1-я палова V ст.)

1. Перыядызацыя гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.
2. Асноўныя наміналы перыяду рымскага дэнарыя (дэнарыі, аўрэўсы, сестэрцыі).

Перыядызацыя гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі распрацавана ў работах В.Н.Рябцэвіча на падставе аналіза тапаграіі знаходак асобных манет і манетных скарбаў.

1.Перыяд Рымскага дэнарыя (канец I ст. н.э. –пач.V ст. н.э.).
2.Безманетны перыяд (1-я трэць III – пач. IX ст.).
3.Перыяд куфічнага дзірхама (пач. IX ст. – 80-я гг. X ст.).
4.Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец X – 60-я гг. XI ст.).
5.Безманетны перыяд (60-я гг. XI ст. – XIII ст.).
6.Перыяд Пражскага гроша (XIV – XV стст.).
7.Грашовае абарачэнне ў Беларусі (канец XV – сярэдзіна XVII ст.).
8.Грашовае абарачэнне ў Беларусі ў др. пал. XVII – XVIII ст.
9.Грашовае абарачэнне ў Беларусі з канца XVIII ст. па кастрычнік/лістапад/ 1917 г.
10.Савецкі перыяд (кастрычнік/лістапад/ 1917 – снежань 1991г.).
11.Грашовае абарачэнне ў Рэспубліцы Беларусь (1991-2011).

Перыяд рымскага дэнарыя (антычны) прадстаўлены 3 наміналамі:

Дэнарыі – срэбныя манеты (маса 2,6—2,7 г) са стандартным афармленнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паходжанне тэрміна дэнарый (лац. denarius –ад “deni” – “па дзесяць” – на дэнарый прыходзілася 10 медных асаў.

Av. – профільны партрэт імператара і колавая легенда.

Rv. – боская ці міфалагічная выява і колавая легенда.

Залатыя аўрэўсы (маса – 6,5 г), стандартны тып афармлення.

Паходжанне тэраміна аўрэўс – ад лац. aurum – золата.

Бронзавыя ці медныя сестэрцыі (маса – да 20 г). Стандартны тып афармлення – На Rv. – літары S – C (“па рашэнню Сената”).

Паходжанне тэраміна сестэрцый – ад лац. semis tertius – “два з паловай” – на сестерцый прыходзілася адпаведная колькасць асаў.

Аналіз тапаграфіі знаходак рымскіх манет на тэрыторыі Беларусі паказвае, что большасць іх канцэнтруецца на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай вобласцяў, што звязана з праходжаннем праз Польшчу “бурштыннага шляху”, які звязваў Рым і Балтыю.

З падзеннем Рыма – вываз манет спыняецца.

Гэтыя манеты выкарыстоўваліся на тэрыторыі Беларусі не як грошы, а як дзіковінны тавар.

Менавіна рымскія манеты далі мясцоваму насельніцтву ўяўленне аб грошах.

Скарб – 1993 г. – вв. Малеч і Кабакі Брэсцкай вобл. – 380 манет I ст. – пач. III ст. Захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным музеі.

З 1-я трэці III ст. па пачатак IX ст. на тэрыторыі Беларусі разгортваецца безманетны перыяд (першы на тэрыторыі Усходней Еўропы).

Развіваецца таварная вытворчасць, традыцый манетнай вытворчасці няма.

## Тэма 6 Перыяд куфічнага дзірхама (IX – 80-я гг. X ст.)

1. Куфічны дзірхам. Паходжанне тэрмінаў *куфічны*, *дзірхам*. Дзірхамы – першыя рэальныя грошы на тэрыторыі Беларусі. Грашовая тэрміналогія.

**2**. Вызначэнне і характарыстыка асаблівасцяў асобных этапаў у перыядзе куфічнага дзірхама (IX ст. – 833; 833 – 900; 900 – 938; 938 – 980-я гг.).

Куфічны дзірхам – срэбная манета Арабскага Халіфата (маса – 3,2 – 3,6 г., дыяметр – 22-32 мм).

Дзірхам (араб. ад гр. “драхма” – горсць, кісць рукі, пруты, якія змяшцаюцца ў горсці.

“Куфічны” – іракскі горад Ал-Куфа, дзе распрацавалі складанае геаметрычнае напісанне літараў, што выкарыстоўвалася для напісання легенд на манетах Арабскага Халіфата.

Стандартны выгляд – аверс і рэверс– легенда радковая і колавая.

У легендзе – цытаты з Карана, імя халіфа ці эміра, дата, месца чэканкі і г.д.

Дзірхам – монаэпіграфная манета.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыклад легенды:

Аверс – Няма бога, акрамя Аллаха адзінага. Няма яму сатаварышчаў. Аллаху належыць ўлада заўседы і потым настане яго час, калі прававерныя ўзрадуюцца трыўмфу Алаха. Ва славу Алаха чаканен сей дзірхам у Аш-Шашы ў годзе 9 і 90 і 200 (299 х.=911/912 н.э.).

Рэверс – У імя Алаха Мухаммад пасланік Алаха Ал-Муктадір білах Ахмад ібн Ісмаіл Мухамад пасланнік Алаха паслаў яго з кіраўніцтвам і сапраўднаю верай, каб мог ён здзейсніць перамогу над усімі іншымі вераваннямі, калі навад супраціўляюцца гэтаму язычнікі.

Дзірхамы – па сутнасці – першыя сапраўдныя грошы на тэрыторыі Беларусі.

Дзірхам – звычайны сродак плацяжу і накаплення.

Фрагменты – ½, ¼ рабіліся рэзаннем нажніцамі.

Пісьмовая фіксацыя дзірхамаў.

Нагата – 2 дзірхама (“нагд” ад арабскага – паўнавартасны).

Куна – 1 дырхам (“куніца”).

Рэзана – ½ дзірхама, (“рэзаць”).

Векша (“веверіца” – ваверка) – самая дробная адзінка, дакладных звестак няма.

Дзірхамы – першыя рэальная грошы на тэрыторыі Беларусі. На тэрыторыі Беларусі яны выконвалі ўсе пяць функцый грошай.

Вызначаюць 4 этапы.

Пачатак IX ст. – 833; 833 – 900; 900 – 938; 938 – 980-е гг.

1) Пачатак IX ст. – 833 гг.

Вызначаюцца 3 характэрныя асаблівасці.

Пераважае чаканка 2-х дынастый – Умайадаў і Абасідаў.

Пераважаюць дзірхамы, чаканеныя на тэрыторыі Паўночнай Афрыкі.

У скарбах маюцца манеты Ірана (у канцы VII ст. увайшоў у склад Арабскага Халіфата) дынастыі Сасанідаў – драхмы.

2) 833 – 900 гг.

Пераважаюць дзірхамы халіфаў Абасідаў.

З’яўляюцца дзірхамы эмірскіх чэканак.

3) 900 – 938 гг.

Памяншаецца колькасць манет халіфскай чаканкі.

Павялічваецца колькасць манет эмірскіх манетных двароў (у большасці найбольш магутнага на той час рода Саманідаў – манетныя двары – Бухара, Самарканд, Аш-Шаш).

4) 938 – 980-е гг.

У скарбах павялічваецца колькасць саманідскай і іншых эмірскіх чаканак.

Самы малады скарб дзірхамаў на тэрыторыі Беларусі 90-я гг. XIX ст. – в. Красная Міерскага р-на Віцебскай вобл., схаваны прыблізна ў 986-987 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы пярыяду ў сувязі з унутранымі палітычнымі і эканамічнымі прычынамі сістэматычнае паступленне дзірхамаў паступова спыняецца (скарачэнне аб’емаў вырабу срэбра, феадальныя ўсобіцы).

У скарбах, у жаночых пахаваннях сустракаюцца дзірхамы з дзірачкамі ці вушкамі.

Аналіз тапаграфіі знаходак дзірхамаў на тэрыторыі Беларусі паказвае іх канцэнтрацыю ў Падняпроўі і Паддзвінні – адрэзак знакамітага гандлёвага шляху “з вараг у грэкі”, які абслугоўваўся арабскай манетай.

Каз’янкаўскі манетны скарб (1972) – самы значны скарб дзірхамаў Х ст. на тэрыторыі Беларусі – 7711 экз.

**Тэма 7 Перыяд заходнееўрапейскага дэнарыя (канец Х ст. – 60-я гг. ХІ ст.).**

1. Заходнееўрапейскія дэнарыі. Аналіз тапаграфіі знаходак заходнееўрапейскіх дэнарыяў на тэрыторыі Беларусі.
2. Першыя манеты Русі – златнікі і срэбранікі.

Дэнарый – заходнееўрапейская срэбраная манета (маса – 1-1,5г, дыяметр – 16-22 мм).

Дэнарый – агульная назва еўрапейскай манеты гэтага часу.

Скарбы дэнарыяў да сярэдзіны ХІ ст маюць прыкладна пораўну англа-саксонскіх дэнарыяў і дэнарыяў Германскай імпэрыі з дадаткамі дэнарыяў іншых дзяржаў. У далейшым у скарбах пераважаюць германскія дэнарыі.

Скарачэнне і спыненне прытока дэнарыяў на тэрыторыю Беларусі – феадальныя ўсобіцы, узнікненне новых гарадоў, узрастанне ўнутраных патрэб ў еўрапейскіх краінах і інш.

Першы вядомы скарб з заходнееўрапейскімі манетамі на тэрыторыі Беларусі быў знойдзены ў 1926 г. у в.Стары Дзядзін Мсціслаўскага р-на Магілеўскай вобл. (захаваны каля 979 г.).

Склад скарба – 201 дырхам, 1 срэбная візантыйская манета, 2 срэбныя дэнарыі Германскай імперыі.

У абарачэнні прысутнічала візантыйская чаканка Х – ХІ стст. – залатыя намісмы, срэбныя міліярысіі, медныя фолісы.

У абарачэнні прысутнічалі першыя манеты Русі – златнікі і срэбранікі.

Златнікі чаканіліся ў Кіеве князям Уладзімірам Святаславічам (маса – прыкладна 4,2 г.), існуюць 2 разнастайнасці.

1.Верагодна прымеркавана да хрышчэння Русі і жаніцьбе Уладзіміра на візантыйскай прынцэсе Ганне.

Аверс – сідзячы князь, над левым плячом – знак Рурыкавічаў – трызубец і кірілічная легенда – “Владимир на столе”.

Рэверс – пагрудная выява Ісуса Хрыста і кірылічная легенда – “Исус Христос”.

2.Чаканены не пазней за Х ст., адрозніваецца аверснай легендай – “Владимир, а се его злато”.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома 11 златнікаў (адзін з іх – страчаны), 10 захоўваюцца ў музеях розных краін.

Срэбранікі маюць наступныя тыпы.

1 тып. Срэбранікі Уладзіміра – 4 разнастайнасці.

1-я разнастайнасць.

Аверс – сідзячы князь з трызубцам над левым плячом і легенда – “Владимир на столе” ці “Владимир, а се его сребро”.

Рэверс – пагрудная выява Ісуса Хрыста і легенда – “Исус Христос” ці “ИС ХС”.

2–4 разнастайнасці.

Аверс – выява князя на прыстоле.

Рэверс – знак Рурыкавічаў у выглядзе трызубца і кірылічная легенда “А се его сребро» ці “Святога Василя” (хрысціянскі патрон Уладзіміра).

Выраблены са срэбра, маса – 2,2-3,38г.

2 тып. Срэбранікі пляменніка Уладзіміра князя тураўскага Святаполка Яраполчыча, які будучы на кіеўскім прэстоле выпускае 3 разнастайнасці срэбраніка.

1-я разнастайнасць.

Аверс – выява князя на прыстоле і кірылічная легенда “Святополк на столе”.

Рэверс – радавы знак Рурыкавічаў у выглядзе трызубца і кірылічная легенда – “А се его сребро”.

Выраблены з білону, маса – 2,3-4,2г.

2-я разнастайнасць.

Аверс – паясная выява апостала Пятра (хрысціянскае імя Святаполка) і кірылічная легенда ПЕТРОС (двойчы).

Рэверс – двузубец і кірылічная легенда ОГЕОС (скаженае грэч. Огіос – святы) ПЕТРОС.

3-я разнастайнасць.

Аверс – выява князя на прэстоле і кірылічная легенда ПЕТОР (далее нечытаемае слова).

Рэверс – двузубец і нечытаемая легенда.

3 тып. Сребранікі князя Яраслаў Уладзіміравіч.

Аверс – выява святога Георгія (патрон Яраполка) і грэчаская легенда – ГЕОРГИОС (чытаецца не полнасццю).

Рэверс – трыцубец і кірылічная легеда ЯРОСЛАВЛЕ СРЕБРО AMHN. Выпрабляліся са срэбра, маса – 3,24—3,8г.

Вядома больш за 700 срэбранікаў. Тройчы яны знойдзены на тэрыторыі Беларусі.

1873 г.– курганны могільнік у р-не маёнтка Вотня Быхаўскага р-на Магілеўскай вобл.

1886 г.– у скарбе з в. Парэчча Талачынскага р-на Віцебскай вобл.

2004 г. – у курганным Мохаўкім могільніку Лоеўскага р-на Гомельскай вобл.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2009 г. – п. Усходні Магілёўскага р-на.

## Тэма 8 Безманетны перыяд (канец XI ст. – XIII ст.)

1. Выкарыстанне ў грашовым абарачэнні зліткаў.
2. Аналіз тапаграфіі знаходак зліткаў на тэрыторыі Беларусі.

Перыяд XI–XIII стст. адзначаны ў гісторыі Беларусі значнымі падзеямі ў сацыяльна– эканамічным і палітычным жыцці. Разгортваецца працэс фарміравання Вялікага Княства Літоўскага, якое працягвала традыцыі дзяржаўнасці, закладзеныя на беларускіх землях у ранейшыя часы (Полацкае, Тураўске княствы). Зразумела, што ўсе гэтыя працэсы павінны былі быць забяспечаны грашовымі сродкамі. Але, як адзначалася вышэй, прыток асноўнага намінала папярэдняга перыяду – заходнееўрапейскага дэнарыя – па аб'ектыўным прычынам быў спынены, а ўласнай манетнай чаканкі на беларускіх землях яшчэ не было.

У сувязі з гэтым пачалося выкарыстанне срэбных плацёжных зліткаў, што мелі адпаведную масу і форму, а таксама назву – грыўні (рублі).

Паходжанне назвы “рубель” тлумачыцца ў некалькіх версіях: напрыклад, магчыма сувязь гэтай назвы са словам “рубіць”; таксама верагоднай з'яўляецца і сувязь со словам “рубец”, які з'яўляўся на адпаведных злітках у працэсе іх адліўкі (падвойнае ліццё).

Матэрыялам для выраблення гэтых грашовых сродкаў служылі запасы дзірхамаў і дэнарыяў, а таксама імпартны срэбны лом.

Грыўні не адразу выціснулі з абарачэння манеты – скарбы XIII ст. часткова ўтрымліваюць і манеты папярэдніх перыядаў.

На тэрыторыі Беларусі сустракаюцца розныя віды грывень, але асноўнымі былі – літоўская (100–110 г), кіеўская (140–165 г) і наўгародская (190–210 г). Назвы плацёжных зліткаў – штучныя і звязаны з асноўнымі цэнтрамі іх вытворчасці, ці з месцам знаходак. Літоўская грыўня мела, акрамя таго, назву “ізрой”, што тлумачыцца нібыта “ізрытай” (порыстай) паверхняй злітка. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, кірылічнае графіці на некалькіх злітках са скарбу, адкрытага ў канцы XVIII ст. у Разані, на якіх да імя, магчыма, іх уладальніка, дадавалася і назва злітка (“Борисов изрой”).

На грыўнях часам сустракаюцца клеймы, але частка з іх з'яўляецца антыкварнымі падробкамі.

Тэрмін “грыўня” выкарыстоўваўся і як адзінка вымярэння масы. У XII ст. грыўня адпавядала прыкладна 204 г. Грыўня срэбра, ў выніку, становіцца грашова–вагавай адзінкай.

Шматлікія пісьмовыя крыніцы, працягваюць узгадванне грашовых тэрмінаў, што ўзніклі яшчэ ў IX–X стст. для вызначэння дзірхамаў і іх частак (нагата, куна, рэзана, векша). Зразумела, што ў разглядаемым перыядзе, яны набылі ўжо новае напаўненне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Слова “куны” яшчэ ў XI ст. выкарыстоўвалася ў сэнсе “грошы”, у ХШ ст. у гэтым сэнсе пачылі выкарыстоўваць і слова “срэбра”.

Дробныя здзелкі куплі–продажу адбываліся з дапамогай “футравых” грошай – скурак пушных звяроў. У якасці грошай маглі выкарыстоўваць і іншыя адпаведныя тавары са стабільнай вартасццю.

На тэрыторыі Беларусі было знойдзена некалькі цікавых скарбаў грывень.

У 1893 г. на беразе Дняпра каля в. Задрућце Рагачоўскага р–на Гомельскай вобл. быў адкрыты самы вялікі дэпазіт плацёжных зліткаў у Беларусі. Глінянае начынне ўтрымлівала 89 цэлых і 3 фрагментаваных злітка агульнай масай 14,5 кг. Скарб датуецца XIII ст. Дэпазіт быў размеркаваны паміж музейнымі і прыватнымі калекцыямі Расіі і замежжа.

У 1979 г. у в. Вішчын Рагачоўскага р–на Гомельскай вобл. быў знойдзены ўнікальны грашова–рэчавы скарб. У яго складзе 18 плацёжных зліткаў (8 літоўскага, 6 кіеўскага і 2 наўгародскага тыпу, а таксама 2 паўпалціны літоўскага і наўгародскага тыпа). Гэта першы зафіксаваны выпадак знаходкі ў Беларусі адразу трох відаў грашовых зліткаў. Рэчавая частка скарбу прадстаўлена аздобленымі пазалотай, зярненнем, перагародчатай эмаллю срэбнымі ювелірнымі вырабамі (бранзалеты, колты, падвескі). Знешні выгляд скарбу, адсутнасць упакоўкі сведчаць аб тым, што гэты дэпазіт можа быць вызначаны як скарб «надзвычайных абставін», утвораны ў экстрымальнай сітуацыі. Скарб датуецца сярэдзінай XIII ст. Месца захоўвання – Нумізматычны кабінет гістарычнага факультэта БДУ [18, с. 140].

Арэал знаходак грыўняў супадает з арэалам распраўсюджання на тэрыторыі Беларусі заходнееўрапейскага дэнарыя (Верхняе Падняпроўе і Паддзвінне). Існуе яшчэ адна характэрная дэталь – зліткі ў выглядзе скарбаў сустракаюцца часцей, чым адзінкавыя знаходкі, што яшчэ раз падкрэслівае выкарыстанне іх для вельмі значных плацяжоў.

Спыненне прытока заходнееўрапейскага дэнарыя прывяло да ўтварэння манетнага вакуума, які, пры адсутнасці ўласнай чаканкі, быў запоўнены зліткамі–грыўнямі (рублямі), прадстаўленымі на тэрыторыі Беларусі, у абсалютнай большасці, 3–мя відамі: кіеўскімі, наўгародскімі і літоўскімі (“ізроямі”). Працягвалася і выкарыстанне традыцыйных ужо лічыльных паняццяў (напрыклад, нагаты, куны), атрымаўшых новае напаўненне. Пэўную інфармацыю па безманетнаму перыяду захоўваюць тагачасныя пісьмовыя крыніцы.

## Тэма 9 Перыяд пражскага гроша (XIV – XV стст.).

1. Пражскі грош.
2. Фарміраванне манетнай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Перыяд пражскага гроша характарызуецца разгортваннем працэса складання беларускай народнасці і завяршэння аб'яднання беларускіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага.

Назва наступнага перыду ў гісторыі грашовага абарачэння звязана з пануючай у Вялікім Княстве Літоўскім і іншых еўрапейскіх краінах да канца XV ст. срэбнай манетай – пражскім грошам.

Першыя пражскія грошы былі адчаканены ў 1300 г. на манетным двары ў Кутнай Горы (Чэхія), дзе было адкрыта багатае радовішча срэбра. Існуе легенда, якая тлумачыць назву мястэчка Кутна Гора ("старая манаская рыза"). У ёй гаворыцца, што на месцы радовішча нейкаму манаху прысніліся срэбныя злiткi, а прачнуўшыся, ён, для памяці, накрыў гэтае месца сваёй старой рызай.

На аверсе пражскага гроша – каралеўская карона і кругавая легенда, якая ўтрымлівае імя эмітэнта. На рэверсе – выява двухвостага льва (геральдычны сімвал Чэхіі) і кругавая легенда – "Grossi pragenses"/"Грош пражскі".

Эмісію пражскіх грошаў здзейснялі – Вацлаў II Пржэмыславіч (1278–1305) – чаканка 1300–1305; Ян I Люксембург (1310–1346); Карл I Люксембург (1346–1378); Вацлаў IV Люксембург (1378–1419); Георгій Падэбрад (1457–1471).

Пражскія грошы ў пісьмовых крыніцах маглі называцца – "шырокі", "добры", "прагскі", "чэскі", "плоскі". Склад беларускіх манетных скарбаў гэтага перыяду практычна аднастаен – 96% – эмісіі Вацлава IV, астатнія эмітэнты – 4%.

Першае ўзгадванне пражскага гроша ў беларускіх крыніцах адносіцца да 1337 г. У сувязі з тым, што пражскія грошы паступалі на пскоўскія і наўгародскія землі праз тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага, у мясцовых пісьмовых крыніцах іх называлі "грошамі літоўскімі" (рэальна літоўскі грош з'явіўся толькі ў 1535 г.).

Паступленне пражскага гроша на беларускія землі адбывалася праз паўднёвую Польшчу, Галіцыю, Кіеўшчыну, Чарнігаўшчыну, адкуль гэта манета пападала на тэрыторыю беларускага Падняроўя.

З пачаткам гусіцкіх войнаў (1419–1434) і спыненнем (да 1457 г.) чаканкі пражскага гроша, Кутнагорскі манетны двор страчвае былые пазіцыі найбуйнейшага еўрапейскага цэнтра манетнай вытворчасці.

У гэты перыяд на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага як вынік значнай ступені эканамічнага развіцця існавала развітая вагавая і лічыльна–грашовая сістэмы. У выкарыстанні было паняцце вагавай адзінкі для срэбра – грыўні. Існавала пражская грыўня – 210–219 г, кракаўская грыўня – 197,68 г, якая падзялялася на 4 вярдунка (фертона), 24 скотца (скойца), 96 кварт.

Як лічыльна–грашовыя тэрміны выкарыстоўваліся рубель (100 пражскіх грошаў), палціна (50 пражскіх грошаў), капа (60 пражскіх грошаў, прадметаў), паўкапы (30 пражскіх грошаў, прадметаў), польская лічыльная грыўня (48 пражскіх грошаў).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для вызначэння агульнага паняцця “грошы” у другой палове XIV ст. пачынае выкарыстоўвацца тэрмін “пенязі” (раней у гэтым сэнсе выкарыстоўвалі словы “куны”, “срэбра”).

Гэты перыяд – час, калі пачала складацца манетная сістэма Вялікага Княства Літоўскага. Выпуск уласнай манеты, зразумела, быў вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы. Эмісія першых манет насіла дэкларатыўны характар.

Існуе шэраг версій аб часе пачатку чаканкі літоўскіх дэнарыяў, а таксама аб іх эмітэнце (Вялікія князі Альгерд, Ягайла). Найбольш аргументаванай з’яўляецца канцэпцыя, паводле якой эмісія найстаражытных агульнадзяржаўных манет Вялікага Княства Літоўскага была здзейснена Вялікім літоўскім князям Ягайлам (1377–1392) каля 1386–1387 гг. у Вільні [56, с. 176].

Такім чынам, у апошняй чверці XIV ст. чаканяцца першыя агульнадзяржаўныя манеты Вялікага Княства Літоўскага – срэбныя літоўскія дэнарыі, якія атрымалі мясцовую назву – “пенязі”. Найбольш верагодным месцам чаканкі гэтай манеты з’яўляецца Вільна.

Рэдкія адзінкавыя знаходкі літоўскіх дэнарыяў на тэрыторыі Беларусі канцэнтруюцца ў паўночна–заходнем рэгіёне краіны [83].

Нумізматычныя калекцыі Нацынальнага гісторыка-культурны музея–запаведніка “Нясвіж”, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Нумізматычнага кабінета БДУ, Музейнага фонду Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь маюць у сваім складзе раннія літоўскія дэнарыі.

Манетны фонд беларускіх зямель разглядаемага перыяду ўключаў у розных аб’ёмах і шэраг іншых грашовых адзінак

Папулярнай залатой манетай з канца XV ст. быў вугорскі (венгерскі) дукат. Дукат меў 23,5 каратную пробу і стандартную агульную масу ў 3,5 г. (3,44 г складала маса хімічна чыстага золата).

Паходжанне назвы – дукат (ад лац. ducatus – герцагства) звязваюць з апошнім словам легенды –“SIT TIB CHRISTA DATUS QUEM TU REGIS JESTE DUCATUS”/“Гэта герцагства, якім ты кіруеш, табе Хрыстос прызначаецца”. У рэчаіснасці назва “дукат” выкарыстоўвалася значна раней для срэбнай манеты некаторых італьянскіх герцагстваў.

У грашовым абарачэнні прысутнічалі таксама срэбныя шылінгі (соліды) Лівонскага Ордэна, срэбныя дзірхамы і медныя пулы Залатой Арды, англьскія ноблі (мелі яшчэ неафіцыйную назву – “карабельнікі”, таму што на аверсе была выява карабля і постаць каралеўскай асобы), кракаўскія грошы, галандскія дэнарыі, медныя сярэднеазіяцкія манеты і інш.

### Тэма 10 Грашовае абарачэнне ў канцы XV ст. – сярэдзіне XVII ст.

1. Уніфікацыя манетнай сістэмы па рэформе Стэфана Баторыя (1578–1580).

2. Талер. Мясцовая тэрміналогія.

3. Расійская грашовая сістэма XV–XVII стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спробы ўніфікацыі манетнай сістэмы.

У XVI ст. адбылося канчатковае фарміраванне манетнай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага. Чаканяцца ўласныя варыянты асноўных еўрапейскіх наміналаў – грош (1535), дукат – (1547), талер – (1564).

Па рэформе Стэфана Баторыя (1578-1580) практычна створана адзіная польскі-літоўская манетная сістэма.

Традыцыйна захоўваецца ўлік на літоўскія і польскія грошы (польскі=8 дэнарыям, літоўскі=10 дэнарыям).

Польскі грош называлі – асмак, лядскі, польскі, сужоны. Літоўскі – літоўскім.

Манетныя двары ВКЛ – Віленскі з канца 1492, Тыкоцынскі – з 1566 г.

Лічбавыя паняцці – злоты (30 польскіх грошаў), копа (60 літоўскіх грошаў), рубель (100 літоўскіх грошаў).

Вышэйшы срэбны намінал – талер.

Першыя таляры з'явіліся ў 1518 г. у Іоахімстале (Чэхія).

У беларускіх пісьмовых крыніцах паходжанне таляраў вызначалася наступным чынам – ріксдаальдзеры Паўночных Нідзерландаў называліся палашнікі, лёвендаальдзеры Паўночнанідзерландскіх Правінцый – леўкі, таляры ляўковыя, левікі, патагоны Гішпанскіх Нідзерландаў – крыжовыя, 8 рэалаў Гішпаніі – реелы, реелавыя, рыялавыя.

Своеасаблівай групай у грашовым абарачэнні сталі гішпана-неапалітанскія манеты – піліпкі – таляры (дукатоны) і паўталяры Піліпа II і паўталеры Карла 5.

Абарачэнне іх на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага было ўзаконена – круглай кантрамаркай – вензель SA і дата 1564, мелі афіцыйна ўзаконены завышаны курс – талер – па 60 грошаў польскіх (реальна – 33,5 польскага гроша), паўталеры – па 30 грошаў (рэальна – па 16,75 гроша польскага). Гэта – першыя крэдытная грошы ў краіне.

Знаходкі піліпкоў на тэрыторыі Беларусі.

У абарачэнні былі таксама шылінгі Лівонскага Ордэна; драйпёлькеры (1,5 гроша) Прусіі; медныя манеты Шатландыі – торнеры (падвоеныя пені) 1632-1633гг. (у беларускіх скарбах 1640-1650 гг., даты на іх няма, выява чартапалоха і легенда "ніхто не дакранецца да мяне без пакарання", – для дробных разлікаў – піянеры меднаграшовага абарачэння Вялікага Княства Літоўскага); дукаты – большасць – заходнеяўрапейская чаканка, яны не адрозніваліся ў рэальных вартасцях, таму пісьмовыя крыніцы не ўказваюць на іх паходжанне, выключэнне для венгерскай чаканкі – "вугорскія".

Расійскае грашовае абарачэнне XV– XVП стст. не ведала ўласных залатых манет (выключэнне – 1610-1613 гг.)

Замежныя залатыя манеты паступалі на расійскі рынак і выкарыстоўваліся не як плацежны сродкі, а як тавар. Залатыя манеты збіраліся ў царскіх і царкоўных сховішчах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Скарбы залатых манет XV–XVП ст., столь значныя ў Украіне і ў Беларусі, на тэрыторыі Расіі невядомы. Золата паступала ў выглядзе дукатаў, двайных, трайных дукатаў, карабельнікаў, партугалаў.

Да пачатку XVП ст. денга была асноўным наміналам.

Пасля рэформы Алены Глінскай (1534) – па ўсей тэрыторыі ў абарачэнні знаходзіліся срэбныя манеты:

– наўгародка (капейка),

– маскоўка (дзенга=1/2 капейкі),

– палушка (палова дзенгі ,1/4 капейкі).

Да пачатку XVП ст. наўгародка-капейка захоўвала перашапачатковую масу – каля 0,68 г.

На працягу XVП ст. – маса і памер паменшыліся да 0,28 г. У другой палове XVП ст. – большы дыяметр 7-8мм.

Назвы наўгародка і маскоўка – агульнадзяржаўныя назвы.

Замежныя манеты ў абарачэнне не дапускаліся, уся маса замежных срэбных манет пераплаўлялася для манетнай і ювелірнай справы.

Непапулярнасць ў Беларусі капеяк – нязручны і да таго існавала забарона на вываз срэбра з Расіі. Выкарыстоўваліся на ювелірныя вырабы.

Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай (1654-1667) прывяла да з'яўлення на мясцовых рынках расійскага срэбра.

Пасля грашовай рэформы Аляксея Міхайлавіча 1654-1663 гг. у абарачэнні на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца наступныя наміналы:

Срэбра:

– рубель 1654 г.,

– паўпалціна (чацвертак) – чэканілась з 1654 г. на цэлых і разрубленых на 4 часткі талярах з папярэднім знішчэннем выяў,

– яфімкі і паўяфімкі з "прызнакам" – на цэлых разрубленых на палову талерах са збітай выявай – кантрамаркіраваліся двума клеймамі – круглым і прамакутным.

Рублёвікі і яфімкі ўспрымаліся ў Беларусі як звычайныя талеры.

Медзь:

– капейка, дзенга, грош (2 капейкі), алтын, палцінік.

У Беларусі медную манету байкатавалі.

Лічбавыя паняцці – алтын (3 кап.), грывеннік (10 кап.), палціна (50 кап.), рубель (100 кап.).

**Тэма 11 Грашовае абарачэнне ў 2-й палове XVII – канцы XVIII ст.**

1. Манетныя двары Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы.
2. Рэформа Яна Казіміра Вазы (1659–1666).
3. Грашовыя рэформы 1752, 1766, 1787, 1794 гг. у Рэчы Паспалітай.
4. Грашовая рэформа Петра I (1700–1704–1718).

Манетныя двары Вялікага Княства Літоўскага – Віленскі – 1492, Тыкоцынскі – 1566, Гродненскі – 1706, Ковенскі – (1655 – 1666).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Манетныя двары Польшчы – у Быдгошчы, Варшаве, Кракаве, Льве, Гданьске і іш.

Літоўскія эмісіі – соліды (білон і потым медзь – шэлегі), срэбра – 3,6-грашовікі, орты (ням. чверць нейкай манеты, у дадзеным выпадку – таляра, маса прыкладна 7 г, на ортах XVII–XVШ стст. стаіць "18" – гэта значыць – 18 грошаў), золата – палова дуката, дукаты.

Польскія эмісіі – соліды (білон і потым медзь), білон – 1,5 грашовікі, 30-грашовікі, срэбра – 3,6-грашовікі, орты, таляры, золата – палова дуката, дукаты, двайныя дукаты, партугалы.

Солід – першапачаткова – залатая рымская манеты, з XVП ст. – размены намінал з білона, медзі. Мяцовая назва – "шэлегі"("ні шэлега няма"). Падробныя шэлегі называлі – "клепочы", "злыя шелегі".

Грашовая рэформа Яна Казіміра Вазы (1659-1666), яе прычыны. У абарачэнні з'явіліся медныя соліды і білоныя 30-грашовікі.

Ініцыятар з'яўлення меднага соліда – Ціт Лівій Бораціні. Вядомы ў Еўропе навуковец, архітэктар, займаўся горнай справай, фізікай, оптыкай, механікай, метралогіяй (прыдумаў адзіную сістэму мер для Еўропы), гравер па медзі, стварыў ва Уяздаўскім замку пад Варшавай буйную абсэрваторыю, прыдумаў складаную гідраўлічную машыну, зрабіў вагі, якія ўзважывалі волас, мадель летальнага апарату.

У Рэчы Паспалітай ён звярнуўся да фінансаў, арэндаваў Кракаўскі манетны двор і атрымаў права на чаканку залатых і срэбных манет, але іх намінальная вартасць на 25% вышэй у срэбраных і на 37,5 % вышэй ў білоных – выпуск непаўнавартасных манет.

1659 г. распрацаваў новы план – эмісія медных солідаў з афіцыяльным курсам ранейшых білоных солідаў, гэта значыць – па кошту 1/3 срэбнага гроша.

Эмісія медных солідаў вызначана сумай у 2 млн. злотых (па 1 млн. для Польшчы і Вялікага княства Літоўскага). Агульны наклад – 180 млн экз. (1 зл.=30гр., 1гр.=3 солідам, 1 зл=90 солідам). Рэальная вартасць соліда = 15% ад намінальнай [з 1 фунта медзі=15 гр (45 солідаў) = 100гр. (300 сол.); 300--100%, 45 – х, х=4500:300=15%].

Выбіта не на 2, а на 4 млн. злотых . З сярэдзіны 1663 г. – відавочны крызіс праекта па выпуску шелегаў.

Тымф – 30 грашовая манеты, нізкапробнае срэбра, па сутнасці білон (50 на 50%). Маса – 6,72 г (срэбра = 3,36 г).

Праект братоў Анджэя (Андрэй) і Томаса (Фама) Тымфаў – выпуск монеты ў 1 злоты (злотувка) – у 30 срэбраных грошаў. Выпускам займаліся Львоўскі манетны двор, Быдгошч, магчыма, Кракаў. Замацавалася назва тымф.

У легендзе – "30 грошай", у рэчаіснасці – срэбра на 12 грошаў – рэальны кошт – 40% ад намінальнага (30гр.–100%, 12гр.–х%, х = 12х100:30=40%). Наклад – 9 млн. У якасці кампенсацыі на аверсе легенда – "жаданне выратаваць Бацкаўшчыну – перавышае сапраўдны кошт металу".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Папулярнасці няма. Сваеасаблівая расшыфроўка манаграмы ICR – Initium calamitatis Regni – пачатак пагібелі дзяржавы. Будучы непаўнавартаснымі грашыма, барацінкі і тымфы сталі матэрыяльным увасабленнем ускосных падаткаў для насельніцтва.

На рынках існавала дзве паралельныя сістэмы – медная і срэбраная. Паняцце "наддача" вызначала дадатковую суму пры вяртанні меддзю ўзятых срэбрам грошаў. З другой паловы XVII ст. знікае практыка ліка грошаў на літоўскія і польскія.

Эканамічныя праблемы. Пошукі выйсця з фінансавага тупіка. З сярэдзіны XVII ст. польская манета пачынае чаканіцца ў Саксоніі. З 1749 г. меднаграшовыя эмісіі чаканяцца на манетных дварах Дрэздэна, Грюнталя, з 1752 г. срэбраная, білоная, залатая манета чаканяцца ў Лейпцыгу.

1752 – грашовая рэформа – навацыі – набліжэнне па якасці і метралогіі польскага талера з саксонскім+ новыя манеты – медны грош, срэбныя 8 грошай, залаты аўгустдор (5 талераў), паўаўгустдор (2,5 талера), двайны аўгустдор (10 талераў).

У 1753 г. прускі кароль Фрыдрых II арганізаваў у Кёнігсбергу, Брэславе, Шчэціне чаканку нізкапробных манет штэмпелямі, падобнымі на лейпцыгскія.

У 1756 г. пачалася Семігадовая вайна (1756 – 1763), Прусія захапіла абсталяванне Лейпыгскага манетнага двара – для фабрыкацыі фальшывых манет – даручана берлінскім банкірам Эфраіму, Ізаону і Іцыку (чаканілі непаўнавартасныя залатыя, срэбныя і медныя манеты) – іх назва "эфраімкі" – знайшлі распаўсюджванне ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім.

1765 – адкрыццё Варшаўскага манетнага двара – цэнтр грашовай вытворчасці ў Рэчы Паспалітай (працягвалі працаваць гарадскія манетныя двары – Торунь, Гданьск).

1766 – грашовая рэформа – упарадкаванне грашовай сістэмы (1. паніжэнне курса дуката – 18 да 163/4 злотага – і высокая проба срэбраных манет прывялі да вывазу срэбра за межы краіны; 2. павышэнне кошта імпартуемай медзі, золата і срэбра павысілі кошт прадукцыі Варшаўскага манетнага двара).

1787 – грашовая рэформа – імкненне да удасканалення грашовай сістэмы.

1791 – Канстытуцыя Рэчы Паспалітай – на буржуазны шлях. Супраць – Таргавіцкая прарасійская канфедэрацыя.

У 1793 – на Гродзенскім манетным двары – маланакладны выпуск талера (6 – 10 тыс.) – талер Таргавіцкай канфедэрацыі.

Аверс – "Грамадзянам, якіх любоў да Бацькаўшчыны прывяла да аднаўлення разбуранай і пахаванай замовай дня 3 траўня 1791 [года] свабоды Рэчы Паспалітай, якая аднаўляецца. Удзячнасць грамадзянам – прыклад нашчаткам".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэверс – “Дэкрэтам Рэчы Паспалітай, якая ўмацаванна вузамі канфедэрацыі, дня 5 снежня 1792 [года]– у кіраванне Станіслава Аўгуста. 10 7/16 [штукі] з маркі чыстай кёльнскай. 1793 [год].

1794 – паўстанне Тадэвуша Касцюшкі. Фінансы перададзены пад начала Вышэйшай Народнай Рады (галоўны выканаўчы орган).

8.06.1794 – Рада – Маніфест аб грашовай рэформе (зніжана проба талера, скасаваны медныя манеты і паўталеры) +новыя манеты – білоны 6 грашовік, залатыя станіслаўдоры (3 дуката), паўстаніслаўдоры (1,5 дуката).

1794, жнівень – выпуск папяровых грошай на 74 млн. злотых – казначэйскія білеты – 5,10,25,50,100,500,1000 злотых і разменныя наміналы – 5,10 грошай і 1,4 злотых.

У 1794 г., лістапад – папяровыя грошы абвешчаны па-за законам.

1795 – Варшаўскі манетны двор закрываецца (часова).

Рэформа Петра I (1700 – 1704 – 1718):

1700 – медзь – денга, палушка, паўпалушка;

1701 – срэбра – палцінік, паўпалціннік, грывеннік, дзесяць грошаў (5 капеяк), золата – чырвонец (3,4г). і двайны чырвонец.

1704 – медзь – капейка, срэбра – рубель, алтын.

Уведзена ўпершыню ў свеце дзесяцірычная грашова-вагавая сістэма (не ўкладаўся толькі алтын).

Пасля завершэння рэформы з’явіліся круглыя срэбраныя капейкі (1713 – 1714, 1718), медныя пяцікапеечнік (1723), грош (2 капейкі, 1724), залаты двухрублевік (з 1718 г., каля 4 г).

Пасляпятроўскі час – найбольшыя навацыі – срэбны 15-капеечнік (пяціалтынны) і 20-капеечнік (двугрівенны) – з 1760 г., залаты пяцірублевік і дзесяцірублевік – з 1755 г.

Чаканка меднай і срэбнай капеяк (з 1813) у 1718 г. часова была спынена.

Лічыльныя паняцці – злоты (30), капа (60), рубель (100).

## Тэма 12 Грашовае абарачэнне ў канцы XVIII – кастрычніку /лістападзе 1917 г

1. Спецыфіка грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.
2. Грашовая рэформа Я.Ф. Канкрына (1839–1843).
3. Грашовая рэформа С.Ю. Віттэ (1895–1897).
4. Дзейнасць Часовага ўрада ў галіне грашовага абарачэння. Асаблівасці грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Першай Сусветнай вайны.

Працяг абарачэння польскіх, літоўскіх і заходнееўрапейскіх манет, згасае прыток нідзерландскіх манет, да 1830-х гг. працягваецца прыток талераў Прусіі, паступае медзь і срэбра герацагства Варшаўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1828г. – указ аб чаканцы манеты з плаціны. Указы 1829 і 1830 г. уводзяць ў абарачэнне плацінавыя 3, 6, 12-рублевікі. У 1845 г. працінавая чаканка спыняецца.

З 1768 г. пачынаецца патаемная чаканка залатой манеты, імітуючай галандскі дукат.

На тэрыторыі Беларусі шырока выкарыстоўваліся манеты Варшаўскага манетнага двара, чаканеныя для Каралеўства Польскага.

Медзь – грошы, 3-грошы, білон – 5-грошаў, 10 – грошаў, срэбра – злотыя, двайныя злотыя, 5-ці златоўкі, 10-ці златоўкі, золата – 25-златоўкі і 50-ці златоўкі.

Легенды – на польскай мове.

Да 1835 г. на медных і білоных манетах змяшчаўся дзяржаўны герб Расіі – двуглавы арол з аднаглавым польскім на шчытку на грудзях.

З 1835 г. польскі арол быў заменены св. Георгіем.

На срэбных і залатых манетах – выява Александра I (захоўвалася на некаторых выпусках часоў Мікалая I).

У 1831–1832 гг. – на рынках Беларусі з'яўляюцца манеты Польскага паўстання 1830–1831 гг. Пасля падаўлення паўстання яны былі выціснуты з абарачэння.

Рагачоўскі манетны скарб 1971 г.

1832 г. (Варшаўскі і Пецярбургскі манетныя двары) – чаканка русско-польскіх манет, вызначэнне намінала на рускай (у капейках і рублях) і польскай (грошы і злотыя) мовах. Усе гэтыя манеты на аверсе мелі выяву расійскага арла. Чаканка спынена ў 1850 г.

З 1769 г. у Расіі пачынаюць выпускацца папяровыя грошы – асігнацыі ("грашовыя абавязкі") у 25, 50, 75, 100 руб.

Асігнацыі атрымалі права на вольнае абарачэнне і на размен меднай манетай ў спецыяльных асігнацыйных банках Пецярбурга і Масквы.

Умова захавання пакупнічай здольнасці папяровых грошаў – адпаведнасць іх масы колькасці паўнавартасных грошай, неабходных для функцыянавання рынка.

У канцы XVIII ст. рубель у асігнацыях ці меднай манеце, каштаваў 68 капеяк срэбрам. У краіне існавалі дзве грашовыя сістэмы – асігнацыйная і срэбная.

Меры па рэарганізацыі фінансаў. У 1839 г. – маніфест аб будучай фінансавай рэформе і абвешчэнне аб увядзенні срэбнага монаметалізма.

Монаметалізм – грашовая сістэма, пры якой адзін з высакародных металаў становіцца ўсеагульным эквівалентам і асновай грашовага абарачэння. Срэбны монаметалізм у Расіі з 1843 па 1852гг.

Правядзенне грашовай рэформы было даручана міністру фінансаў Ягору Францавічу Канкрыну.

З 1839 г. па 1848 г. – чаканка больш важкай меднай манеты – для забеспячэння ўстойлівасці папяровага рубля.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На серыі гэтых манет ад 1/4 да 3 кап. у вызначэнні наміналa ўключана слова “срэбра” (напрыклад, “¼ капейкі срэбрам”).

У 1843г з’явіліся “депазітныя (крэдітныя) білеты” і спецыяльны аддзелы банкаў, што разменівалі іх на залатую і срэбную манеты. Праз некалькі год было абвешчана, што старыя асігнацыі і крэдітныя білеты аб’ядноўваюцца ў адзіную дзяржаўную пазыку і абменіваюцца на крэдытныя білеты новага ўзору. Аперацыя завершана у 1849 г.

Рэформа перавяла грашовую сістэму Расіі на срэбную аснову, пры якой ролю ўсеагульнага эквівалента адыгрывае срэбны рубель.

Урад вырашыў две задачы – умацаванне фінансаў і атрыманне значнага прыбытку за кошт папярова-грашовых эмісій.

У гэты час фонд грашовага абарачэння Беларусі па сутнасці не адрозніваўся ад агульнарасійскага.

З 1876 г. адзіным цэнтрам манетнай вытворчасці становіцца Пецярбургскі манетны двор.

З 1860-х гг. урад звяртаецца да чаканкі манет за мяжой. У 1861 г. разменыя наміналы (10, 15, 20 кап.) чаканяцца ў Парыжы і Страсбургу. У 1896 г. у Парыжы чаканяцца 25, 50 кап. і рубель. У 1896-97 гг. у Бірменгеме чаканяцца медныя 1/4, 1/2, 1, 2, 3 кап. У 1897-99 гг. – палцііннікі і рублі чаканяцца ў Брусэлі і Парыжы.

Спыненне выпуска “вядомай манеты” у 1868 г.

У 1895–1897 гг. міністр фінансаў Сяргей Юльевіч Віттэ праводзіць новую грашоваю рэформу па ўвядзенню ў краіне залатога монаметалізма.

Умова нармальнага функцыянавання залатога монаметалізма:

1.Свабодная чэканка залатых манет пры фіксаваным залатым утрыманні грашовых адзінак.

2.Свабодны размен знакаў вартасці на залатыя манеты. 3.Свабодны вываз золата за мяжу.

Віттэ ўсталяваў свабодны размен крэдытных білетаў (выпуск быў абмежаваны) на залатую манету з разліку адзін папяровы рубель на 1 рубель у золаце. Адначасова было зменшана ўтрыманне золата ў рублі на 1/3.

У выніку гэтага імперыялы і паўімперыялы папярэдніх гадоў, а таксама новыя выпускі ў старой масе сталі раўны адпаведна – 15 і 7,5 рублям.

Са спыненнем чаканкі манет (1914 г. – срэбных 50 капеяк, 1915 г. – білоных 5 капеяк і срэбных 1 рубля, 1916 г. – медных 1/4, 1/2, 1,2,3,5 капеяк, 1917 г. (выпускаліся ў 1916г з датай 1917) – білоных 10, 15, 20 капеяк) урад пускае ў абарачэнне розныя папяровыя грашовыя сурагаты.

Пастановай Савета Міністраў ад 25 верасня 1915 г. у сувязі з недахопам разменнай манеты прымаецца рашэнне аб эмісіі паштовых марок, надрукаваных на тоўстай паперы клішэ юбілейнай (да 300-годдзя дома Раманавых) серыі.

Войны пачатку XX ст. прывялі Расію да дэстабілізацыі эканомікі краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэты перыяд характарызуецца актыўным развіццём крызісных з'яў – узрастаюць знешнія пазыкі, павялічваецца прыток замежнага капітала, спыняецца абмен банкамі папяровых грошай на золата (з 27 ліпеня 1914), з абарачэння знікаюць не толька залатыя і срэбрныя, але і білоныя і медныя манеты.

Часовы ўрад працягнуў актыўны выпуск інфляцыйных папяровых грошай, а таксама «паштовых» марак-грошай.

27 сакавіка 1917 г. з'яўляюцца аблігацыі доўгатэрміновага ўнутранага «Займа свабоды».

У верасні – кастрычніку 1917 г. друкуюцца крэдытныя білеты ў 250 рублёў, а ў чэрвені – 1000 рублёў – «думскія білеты». У верасне – кастрычніку таго ж года ў абарачэнне пускаюцца казначейскія знакі ў 20 і 40 рублёў, названыя "керанкамі».

Першая Сусветная вайна прынесла на тэрыторыю Беларусі прадукцыю манетных двароў Германіі і Аўстра-Венгрыі – пфенігі, маркі, акупацыйныя «острублі» і манетавідныя боны (наміналам у 1,2,3 капейкі) занялі значнае месца ў грашовым абарачэнні рэгіёна.

Акупацыйныя германскія ўлады здзейснялі меры па ўсталяванню на тэрыторыі Беларусі грашовай сістэмы па германскаму ўзору.

## Тэма 13 Грашовае абарачэнне ў савецкі перыяд (кастрычнік /лістапад 1917 – снежань 1991 г.)

1. Папяровыя грошы РСФСР 1919–1921 гг. (саўзнакі). Рэформа 1922–1924 гг.
2. Грашовае абарачэнне ў канцы 1920-х – 1930-я гг.
3. Грашовая рэформа 1947 г. Змена маштаба цен у 1961г. Мемарыяльныя манеты.

Студзень 1918 г.– стварэнне Народнага банка РСФСР (меньш ½ залатога фонда Часовага урада).

Вясна 1918 г.– у краіне – "грашовы голад" – урад вымушаны пусціць у абарачэнне аблігацыі "Займа свабоды", крэдытныя білеты Часовага ўрада – думскія білеты, казначэйскія знакі ў 20,40 рублёў – керанкі, маркі – такім чынам, аднавіць масавыя папяровы эмісіі клішэ манархічнай і буржуазнай Расіі (каля 100 разнастайнасцяў). Уся гэтая маса знаходзілася ў абарачэнні па снежань 1921г.

З сакавіка 1919 г. выпускаюцца недатаваныя купюры у 1, 2, 3 рубля з надпісам – "Расчетный знак РСФСР", гербам РСФСР і лозунгам – "Пролетарии всех стран, соединяйтесь!", памерам 34 х 43 мм, у неразрэзаных аркушах па 25 штук.

У побыту і афіцыйных дакументах усе гэтыя разліковыя знакі РСФСР называліся "саўзнакі". Яны прадстаўлены наміналамі ад 1 да 100000 рублёў.

Рэформа 1922-24 гг.

Дэкрет лістапада 1921 г.:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.новыя грашовыя знакі пад назвай “Государственные денежные знаки РСФСР образца 1922г.”

2.рубль прыраўніваецца да 10 тысяч рублёў крэдытных білетаў, разліковых знакаў і абявязкаў.

3.новыя знакі выпускаюцца вартасцю ў 50 кап., 1, 3, 5, 10, 25, 50, 100, 250, 500, 1000 рублёў.

4.Дзяржаўныя грашовыя знакі ўзору 1922 г. маюць хаждзенне нараўне з крэдытнымі білетамі, разліковымі знакамі, абавязкамі. Пазней выпускаюцца дадаткова купюры ў 5000 і 10000 рублёў.

Ліпень 1922 г. Дзяржбанку надаецца права эмісіі банкаўскіх білетаў, вартасць іх павінна была выражацца ў парытэтных залатому 10-рублевіку царскай Расіі чырвонцах. Выпушчаны купюры ў 1, 3, 5, 10, 25 чырвонцаў.

Канец 1923 г. выпускаюцца першыя папяровыя грошы СССР – 10000, 15000 рублёў. З гэтага часу Дзяржбанк РСФСР перадае функцыі Дзяржбанку СССР.

Люты 1924 г. адбыўся выпуск прывязаных да чырвонца казначэйскіх білетаў у 1, 3, 5 рублёў золатам.

Дэкрэт ад 14.02.24 г. адбылося спыненне эмісій саўзнакаў, яны выкупаюцца ў насельніцтва.

З 1921 г. паўстала пытанне аб чаканцы срэбных манет.

Са жніўня 1921 па 1925 г. (з датамі 1921-1923 гг.) чаканяцца білоныя 20, пазней 10 і 15 кап., срэбныя 50 кап., 1 рубель.

Аверс – герб РСФСР і лозунг.

Рэверс – у дробных – намінал, у вялікіх (50 і 1 рубель) – зорка ў вянку, намінал і дата.

У 1923 г. адбыўся выпуск залатога чырвонца (у асноўным для разлікаў з іншымі дзяржавамі). Аверс – герб РСФСР і лозунг, рэверс – селянін-сейбіт, надпіс – “Один червонец” і дата. Колькасць золата раўнялася 10 дарэвалюцыйным разліковым залатым рублям.

У 1924 г. пачаўся выпуск срэбных і медных манет СССР.

Рубель (1924) і палцінік (1924-27) мелі агульны аверс – Дзяржаўны герб СССР і вызначэнне намінала – “Один рубль”, “Один полтинник”, па колу – лозунг. Рэверс рубля – рабочый абдымае селяніна і ўказвае яму шлях на ўзыходзячае сонца, на рэверсе палціnніка – каваль.

Знешні выгляд манет у 10, 15, 20 кап. – аверс – герб СССР, рэверс – намінал, дата і абрамленне каласоў.

Медныя манеты – 2, 3, 5 кап. (чаканіліся толькі ў 1924, 1 капейка – чаканка ў 1924-25гг.) – паўтор тыпу разменых наміналаў.

З 1925 г. вялася чаканка меднай манеты ў палову капейкі. Аверс – СССР, па колу – дэвіз. Рэверс – намінал (“полкопейки”) і дата.

Рубель набывае высокую пакупнічую здольнасць. Для другой паловы 1920-х – канца 1930-х гг. характэрны навацыі – білеты, вызначэнне намінала якіх не мела слова “золатам” (у 1925 – 3 і 5 рублёў, у 1927 – 1, 3, 5 рублёў новага ўзору).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1927 г. выпускаюцца банкаўскія білеты ў 1 чырвонец (узору 1926 г.), у 1928 г. – 2 і 5 чырвонцаў, у 1932 г. – 3 чырвонца (узору 1928 г.).

У 1938 г. выпускаюцца купюры ў 1, 3, 5, 10 чырвонцаў (узору 1937 г.). На іх адсутнічае тэкст "Банковский билет подлежит размену золотом", упершыню з'яўляецца партрэт В.І. Леніна, знікаюць подпісы адказных асоб Дзяржбанка і Наркамфіна.

З 1926 г.– у мэтах эканоміі медзі дробныя наміналы чаканіліся ў бронзе. Толькі палова капейкі, якая выпускалася да 1928 г. – у медзі.

У 1931 г. – адмова ад срэбра і 10, 15, 20 кап. выпускаліся з нікеля (пускаюцца ў абарачэнне з 1932 г.). Аверс – такой жа як у срэбных, рэверс – рабочый з молатам, абапіраецца на шчыт з вызначэннем намінала і поўнай назвай краіны.

У 1935 г.– знешні выгляд зменены. Нікелевыя і бронзавыя наміналы той жа вартасці, але на аверсе – няма лозунга. Выявы на рэверсах бронзавых манетах папярэднія, на нікелевых – у квадраце з усечанымі вугламі (вакол колас і галінка дуба) змешчаны намінал, знізу дата.

Тып манет, устаноўлены ў 1935 г., заставаўся нязменным да 1961 г. Па меры змянення колькасці саюзных рэспублік у гербе зменялась колькасць віткоў стужкі.

Пад час вайны – манетны двор пераязджае ў Краснакамск Пермскай воб. Вытворчасць ордэнаў, медалёў, манеты – невялікімі тыражамі – 10, 15, 20 кап. увесь час, 1, 3, 5 кап. не чаканіліся ў 1942 і 1944 гг., у 1943 – толькі 3 і 5 кап.

1947 г. – грашовая рэформа ўводзіць новыя папяровы грошы. Манеты захаваліся.

Грашовыя купюры новага ўзору – двух катэгорый – казначэйскія білеты ў 1, 3, 5 рублёў і банкаўскія білеты ў 10, 25, 50, 100 рублёў. Выкуп у адносінах 10 да 1.

З 1 студзеня 1961 г.– змена маштаба цен у 10 раз (1 рубель новымі замест 10 рублёў старымі). Уводзіліся грошы новага ўзору. Манеты ў 1, 2, 3, 5 капеяк абмену не падлягалі.

Уведзены новыя манеты большых наміналаў – белы медна-нікелевы сплаў – 10, 15, 20 і новыя 50 кап. і 1 рубель.

Юбілейныя манеты з'яўляюцца ў 1965 г. – "20 лет Перамогі", 1967 – серыя ў 10, 15, 20, 50 кап. і 1 рубль з нагоды 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, 1970 – у гонар 100-годдзя Леніна, 1975 – у гонар 30 годдзя Перамогі і г.д.

1991-1992 гг.– апошнія грашовыя эмісіі ад імя СССР.

**Тэма 14 Грашовае абарачэнне Рэспублікі Беларусь (з 1991 г.)**

1. Грашовае абарачэнне Рэспублікі Беларусь (1991–1999).
2. Грашовае абарачэнне Рэспублікі Беларусь (2000–2021). Памятныя манеты Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў “Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР”, абвясціўшы, такім чынам, незалежнасць Рэспублікі Беларусь. 25 жніўня 1991 г. Дэкларацыі нададзены канстытуцыйны статус. 19 верасня 1991 г. дзяржава атрымала новую назву– Рэспубліка Беларусь і новыя дзяржаўныя сімвалы. Самастойная дзяржава, зразумела, павінна была мець і ўласную грашовую сістэму.

У 1992 г. была надрукавана, але не пушчана ў абарачэнне першая серыя беларускіх грашовых знакаў наміналам у 1, 5, 10, 20, 50, 100 рублёў з партрэтнымі выявамі вядомых дзеячоў культуры Беларусі – Францыска Скарыны, Якуба Коласа (К.М. Міцкевіча), Максіма Багдановіча, Янкі Купалы (І.Д. Луцэвіча).

У траўні 1992 г. у абарачэнне паступаюць “Разліковыя білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь” – вартасцю ў 50 капеек, 1, 3, 5, 10, 25, 50, 100 рублёў, а на прыканцы года – 200, 500 рублёў; у 1993 г. – 1 тысяча рублёў; у 1994 г. – 5, 20 тысяч рублёў; у 1995 – 50 тысяч рублёў; у 1996 г. – 100 тысяч рублёў; у 1998 г. –500 тысяч рублёў; у 1999 г. – 1 і 5 мільёнаў рублёў. З выявай зайца–русака на банкноце ў 1 рубель (1992) звязана неафіцыйная назва беларускіх грошай – “зайчыкі”.

Разліковыя білеты да траўня 1994 г., калі былі абвешчаны адзіным законным плацёжным сродкам у краіне, знаходзіліся ў абарачэнні разам з савецкімі і расійскімі грашовымі адзінкамі.

Першапачаткова (1992–1994) выкарыстанне ў абарачэнні беларускага рубля 1992 г. мела пэўную спецыфіку – дзесяцікратнае павялічэнне намінальнай вартасці купюры.

У 1994 г. была праведзена першая дэнамінацыя беларускага рубля ў 10 разоў.

1 студзеня 2000 г. праводзіцца другая дэнамінацыя ў 1000 разоў. Рубель, уведзены ў гэтым годзе не меў разменных грашовых адзінак (купюра ў 50 капеек ужо не існавала).

Адначасова, 1 студзеня 2000 г., у абарачэнні з’яўляюцца білеты Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь узору 2000 г. вартасцю ў 1, 5, 10, 20, 50, 100, 500, 1000, 5000 рублёў; у 2001г. – 10000 рублёў; у 2002 г. – 20000, 50000 рублёў; у 2005 г. – 100000 рублёў; у 2012 г.– 200000 рублёў. Дызайн банкнот узору 2000 г. распрацоўваўся ў рэчышчы папярэдніх выпускаў папяровых грашовых адзінак, але са сваімі асаблівасцямі і з больш складанай сістэмай абароны, што ўмацоўвала іх захаванасць ад падробкі.

Банкноты ўзору 2000 г. былі двойчы мадыфікаваны. Першая мадыфікацыя праводзілася ў 2010 г. і была звязана з увядзеннем у беларускай мове новых правілаў арфаграфіі (2008).

Другая мадыфікацыя адбылася ў 2011 г. і была звязана з неабходнасцю ўзмацніць ступень абароны ад падробкі.

1 ліпеня 2016 г. праводзіцца трэцяя дэнамінацыя ў 10000 разоў. Адначасова ў абарачэнне ўводзяцца банкноты ўзору 2009 г. (5, 10, 20, 50, 100,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

200, 500 рублёў), а таксама серыя разменных манет (1, 2, 5, 10, 20, 50 капеек, 1 рубель, 2 рублі).

Тэматыка выяў на гэтых купюрах адлюстроўвала выбітныя помнікі гісторыі і культуры кожнай з шасці абласцей Беларусі (праўда, у рускамоўным алфавітным парадку) і асобна г. Мінска. Купюра ў 5 рублёў прысвечана Брэсцкай вобласці, 10 рублёў – Віцебскай вобласці, 20 рублёў – Гомельскай вобласці, 50 рублёў – Гродзенскай вобласці, 100 рублёў – Мінскай вобласці, 200 – Магілёўскай вобласці, 500 рублёў – г. Мінску. У сувязі з тым, што купюры былі надрукаваны ў 2008 – 2009 гг., яны маюць некаторыя асаблівасці, якія будуць выпраўлены ў працэсе далейшага аднаўлення грашовай масы (напрыклад, факсімільны подпіс тагачаснага Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь П.П. Пракаповіча; на банкноце ў 50 рублёў – надпіс “пяцьдзесят”).

З 1996 г. у Рэспубліцы Беларусь распачынаецца рэгулярны выпуск памятных манет [7]. 27 снежня 1996 г. была адчаканена памятная манета у гонар 50–годдзя Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.

У далейшым былі выпушчаны шматлікія серыі памятных манет, прысвечаныя выбітным асобам, помнікам гісторыі і культуры, жывёльнаму і раслiннаму свету, спартыўным падзеям, народным паданням, казкам, святам, традыцыям беларусаў і г.д. [49; 50; 51].

Беларускія памятныя манеты характарызуюцца высокім узроўнем мастацкага і тэхнічнага выканання, што дазваляе ім станавіцца прызёрамі многіх міжнародных нумізматычных конкурсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

#### Семінарскія заняткі 1
#### Нумізматычнае калекцыяніраванне. Станаўленне навуковай нумізматыкі

1. Нумізматычнае збіральніцтва на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст.
2. Прыватнае калекцыяніраванне манет на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.
3. Музейнае нумізматычнае калекцыяніраванне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – XX ст.
4. Нумізматычныя калекцыі музея свету.
5. Нумізматычная калекцыя Віленскага музея старажытнасцей.
6. Нумізматычныя калекцыі ў музеях Рэспублікі Беларусь.
7. Нумізматычны кабінет Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Літаратура

Воробьева, А. Музейному фонду Национального банка Республики Беларусь – 10 лет / А. Воробьёва // Материалы III Междунар. нумизмат. конф.: «Монета – символ государства», Минск, 27–29 авг. 2007 г. / Нац. банк Респуб. Беларусь. – Банкаўскі веснік [Спецвыпуск]. – 2008. – N 7 [408]. – С. 16–18.

Гужалоўскі, А.А. Нараджэнне беларускага музея / А.А. Гужалоўскі. – Мінск.: НАРБ, 2001. – С.16–41.

Какареко, В. Нумизматическое движение в Беларуси / В. Какареко // Материалы Междунар. нумизмат. конф.: «Музеи банков: цели, задачи, возможности», Минск, 23–25 сент. 2003 г. / Нац. банк Респуб. Беларусь. – Банкаўскі веснік [Спецвыпуск]. – 2003. – N 31 [252]. – С. 33–38.

Колобова, И. Монетные клады в нумизматической коллекции Виленского музея древностей (по материалам каталога 1898 г.) / И. Колобова // Материалы V Междунар. нумизмат. конф.: «Деньги и банки на территории Беларуси: история и современность», Минск, 28–30 сент. 2011 г. / Нац. банк Респуб. Беларусь. – Банкаўскі веснік [Спецвыпуск]. – 2012. – N 7 [552]. – Ч. 2. – С 21–24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Потин, В.М. Монеты. Клады. Коллекции: очерки нумизматики / В.М.Потин. – СПб.: Искусство–СПб., 1992. – С. 5–17; 213–219; 219–235.

Рябцевич, В.Н. Нумизматика Беларуси / В.Н. Рябцевич. – Минск: Полымя, 1995. – С. 3–8.

Скарбы Нумізматычнага кабінета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта /уклад. В.Сідаровіч. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2014. – 20 с.

## Семінарскія заняткі 2
## Матэрыяльныя і знешнія характарыстыкі. Манета ў нумізматычным зборы

1. Матэрыяльныя характарыстыкі манеты. Агульны агляд.
2. Віды манетных проб. Абсалютная лічба.
3. Знешнія характарыстыкі манеты. Агульны агляд.
